# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 25 студзеня 2001 года, чацвер, № 1 (1830)


**ВІНШУЕМ!**

## СЯРОД ЛАЎРЭАТАЎ ПРЭМІІ — ПРАФЕСАР БДУ

Традыцыйнае ўручэнне прэзідэнцкіх прэмій за духоўнае адраджэнне адбылося 7 студзеня ў Палацы Рэспублікі. Лаўрэатамі 2000 года сталі архітэктар, галоўны спецыяліст па архітэктуры архітэктурна-канструктарскага аддзела № 3 г. Баранавічы Леанід Макарэвіч, протаіерэй, настаяцель Свята-Уваскрасенскага сабора г. Брэста, благачынны царкваў Брэсцкай акругі Яўген Парфянюк, прафесар кафедры праектавання выставаў і рэкламы Беларускай акадэміі мастацтваў Павел Семчанка, прафесар кафедры народных рамёстваў Беларускага універсітэта культуры Рыгор Шаура і старшы навуковы супрацоўнік, дактарант Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Алена Яскевіч.

Апрача таго, распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі прысуджаныя і ўручаныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва за высокія творчыя дасягненні ў 2000 годзе па 15 намінацыях.

На ўрачыстай цырымоніі выступіў Патрыяршы Экзарх, мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што ўручэннем прэміяў "За духоўнае адраджэнне" заканчваецца XX стагоддзе ў нашай краіне і мы ўступаем у новае, невядомае, непрадказальнае стагоддзе. Уручэнне прэміяў за духоўнае адраджэнне становіцца добрым пачаткам новага года, стагоддзя і тысячагоддзя. Сёння настаў час збіраць раскіданыя камяні, час ствараць. І ўжо не толькі словы і намеры, але штодзённыя справы і карпатлівая праца прыносяць свой бачны і важкі плён.

Сярод лаўрэатаў спецыяльнай прэміі для дзеячоў культуры і мастацтва за высокія творчыя дасягненні ў 2000 годзе — прафесар кафедры сацыялогіі журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук Барыс Васільевіч Стральцоў. Прэмія нададзена яму за вялікі ўклад у развіццё журналістыкі і кнігу "Публіцыстыка". У гэтым выданні (над якім працавалі Барыс Стральцоў, Леанід Екель, Рыгор Сакалоўскі) прадстаўлена каля 30 публіцыстаў. Там жа змешчана эсэ Б.В. Стральцова, дзе ён ацэньвае стан беларускай журналістыкі і закранае некаторыя іншыя праблемы. Як зазначыў лаўрэат, прэмія — гэта заўсёды нечаканасць, хаця падставы для яе ёсць: летась споўнілася 50 гадоў, як ён прыйшоў у айчынную журналістыку.

Дарэчы, сёлета Барыс Васільевіч Стральцоў адзначыць сваё 75-годдзе. Значная частка яго жыцця звязана з нашым універсітэтам: ён скончыў філалагічны факультэт БДУ, а з 1969 года ўзначальваў кафедру тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі журфака БДУ.

Барыс Васільевіч вядомы не толькі як цудоўны выкладчык і навуковец (кнігі "Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў", "Аналітычныя жанры", "Публіцыстыка: Жанры. Майстэрства", "Фельетон: Тэорыя і практыка жанру", "Основы публицистики. Жанры" і інш.), але і як цікавы пісьменнік (раман "Між крутых берагоў", аповесці "Вячэрняя планета" і "Метраном памяці", зборнікі апавяданняў "Наследнік" і "Сходзяцца бальшакі і прасёлкі", зборнік нарысаў "Дружная рунь").

Віншуем Барыса Васільевіча Стральцова з заслужанай узнагародай і жадаем плёну ў далейшай працы, моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.

*Таццяна КУХАРЧУК*

**КАНФЕРЭНЦЫІ**

## Ад эфектыўнага выкладання да эфектыўнага навучання

Цэнтр праблем развіцця адукацыі БДУ 1—3 сакавіка 2001 года плануе правесці штогадовую рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю "Універсітэцкая адукацыя: ад эфектыўнага выкладання да эфектыўнага навучання".

Асноўная праблема, прапанаваная для абмеркавання, — інтэлектуальная аўтаномнасць і/ці сацыяльная кампетэнтнасць студэнта. Удзельнікі канферэнцыі разгледзяць місію і мэты універсітэцкай адукацыі, выкажуць свае думкі наконт метадаў стварэння эфектыўнага навучальнага асяроддзя.

На сесіі будуць працаваць педагагічныя майстэрні, выставы, арганізаваны панельныя дыскусіі, даклады. Па выніках канферэнцыі плануецца выдаць зборнік артыкулаў удзельнікаў.

Усе заяўкі і прапановы з паметкай "Канферэнцыя" неабходна дасылаць на адрас: Цэнтр праблем развіцця адукацыі БДУ, вул. Бабруйская, 9, п. 304, 305, 308, 220050, г. Мінск альбо па электроннай пошце: edc@org.bsu.unibel.by. Па ўсіх пытаннях наконт удзелу ў канферэнцыі можна звяртацца да арганізатараў па тэлефонах: 206-58-98, 209-51-27, 209-51-26.

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*

**ВЫСТАВЫ**

## ГІСТОРЫЯ ПРАВАСЛАЎНАЙ БЕЛАРУСІ

Фотавыстава, прысвечаная 2000-годдзю хрысціянства, завяршыла 19 студзеня сваю працу на геаграфічным факультэце. Гісторыя праваслаўнай Беларусі ўвачавідкі прайшла перад гледачамі: выявы абразоў, храмы Віцебска і Гомеля, Мінска і Брэста, Гродна і Магілёва і многіх іншых гарадоў і мястэчак нашай Радзімы... А яшчэ — выявы ўсіх беларускіх святых: Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Мікалая Кармянскага, Афанасія Брэсцкага і іншых.

Выстава, арганізаваная праваслаўным брацтвам архістраціга Міхаіла, існуе ўжо паўтара года. За гэты час з ёй змаглі пазнаёміцца жыхары 21 горада. Асаблівую падзяку арганізатары выставы выказалі Белдзяржуніверсітэту за прадастаўленую магчымасць. У нашым універсітэце напярэдадні 2000 года з фотавыставай пазнаёміліся студэнты філалагічнага факультэта, а пасля Новага года — студэнты геафака.

*М. ТАПІЛЯ*

# НОВАБУДОЎЛІ БДУ

Беларускі дзяржаўны універсітэт сёння славіцца сваімі новабудоўлямі і кардынальнымі рэканструкцыямі. Мінулы год азнаменаваўся заканчэннем такога доўгабуду, як біялагічны факультэт у Шчамысліцы. Нарэшце пасля 15 гадоў будоўлі будынак уведзены ў эксплуатацыю, і ўжо з другога семестра там будуць праходзіць заняткі па поўнай праграме.

У мінулым годзе быў выкананы на 80 % аб'ём работ першай чаргі галоўнага корпуса, дзе знаходзіцца фізічны факультэт. І па словах дырэктара дырэкцыі аб'ектаў, якія будуюцца ў БДУ, Уладзіміра Уладзіміравіча Невяркевіча, ён будзе здадзены недзе ў сакавіку-красавіку гэтага года. У гэтым выпадку ёсць чым ганарыцца. Будаўнікі прымянілі сучасныя зносастойкія матэрыялы, а таксама добры дызайн. Цяпер пераходзяць да рэканструкцыі другой чаргі галоўнага корпуса, якi даходзіць ажно да метрапалітэна.

Трэба сказаць, што ў 2000 годзе было пачата будаўніцтва новага корпуса хімфака ў Шчамысліцы, закладзены першы падмурак. Пачалася рэканструкцыя былога корпуса медінстытута па вуліцы Ленінградскай, перададзенага БДУ, дзе з цягам часу размесціцца юрыдычны факультэт.

Працягваюцца работы і па вуліцы Кальварыйскай, 9, куды павінны перабрацца факультэт журналістыкі і факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Калі будзе фінансаванне, гэты будынак закончаць у наступным годзе.

Што датычыцца 2001 года, то ён таксама багаты на планы. У другім яго квартале плануецца пачаць разборку корпуса, у якім сёння размяшчаецца геафак. На яго месцы будзе ўзведзены прыгожы шасціпавярховы будынак, з двума паверхамі пад зямлёй. Тут размесціцца Фундаментальная бібліятэка БДУ.

У гэтым годзе хутчэй за ўсё будзе распачата будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса факультэта міжнародных адносін. Гэта будзе вялікі 13-павярховы будынак, які дапоўніць ансамбль усёй прывакзальнай плошчы, бо ён будзе ўзведзены ў непасрэднай блізкасці да рэстарана "МакДональдс".

Сёлета ўвядуць у эксплуатацыю біястанцыю на возеры Нарач. Тамсама будзе праведзена і рэканструкцыя спальнага корпуса № 2 дома адпачынку "Нарач".

І за ўсё гэта, як вы ўжо зразумелі, адказвае Дырэкцыя аб'ектаў, якія будуюцца ў БДУ.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

**А Ў НАС! А Ў ВАС?**

# СТУДЭНЦКІ КЛУБ МАЛАДЫХ МАМ

17 студзеня 2001 года ў бібліятэцы Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі адбылося другое пасяджэнне клуба з незвычайнай назвай – "Студэнцкі клуб цяжарных", які быў адкрыты ў рамках праграмы "Беларуская мадона XXI стагоддзя".

Гэтыя цёплыя і карысныя сустрэчы для будучых мам і татаў арганізавалі сумесна Міжнародная грамадская дабрачынная арганізацыя "Надзея – Экспрэс", студэнцкі гарадок Белдзяржуніверсітэта і Саюз жанчын БДУ. Чаму менавіта яны? Адным з накірункаў дзейнасці "Надзеі – Экспрэс" з'яўляецца рэпрадукцыйнае здароўе сям'і, асабліва маладой. Як вядома, студэнцкая сям'я трапляе ў самы неабаронены сацыяльны слой, і ёй патрэбна падтрымка. А калі яна пры гэтым яшчэ жыве ў інтэрнаце...

Вечар 17 студзеня прайшоў як мае быць. Цяжарных студэнтак ва універсітэце не так ужо і багата, таму ў камернай абстаноўцы сабралося невялікае кола ўдзельнікаў. П'ючы гарбату пад гукі прыемнай музыкі, будучыя бацькі мелі магчымасць атрымаць кваліфікаваную кансультацыю акушэра-гінеколага, сацыяльнага псіхолага па любым пытанні. І цікаўнасць запрошаных была поўнасцю задаволеная. Вядучыя клуба імкнуліся зрабіць усё мажлівае, каб будучыя маладыя мамы і таты адчувалі сябе падрыхтаванымі і не баяліся з'яўлення на свет свайго дзіцяці (тэма пасяджэння гучала як "Роды без страху").

Наступнае, трэцяе пасяджэнне адбудзецца 21 лютага ў тым самым месцы і ў той самы час. Вядучыя клуба Кацярына і Надзея чакаюць усіх зацікаўленых.

*Юлія ПІМЕНАВА,*
*супрацоўнік прэс-службы БДУ*



# *Запрашаем на выставу*

У навуковай чытальнай зале для прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ (галоўны корпус, 2-і паверх) працуе выстава "Літаратура па сучасных сродках праграміравання і інфармацыйных тэхналогіях". На выставе можна азнаёміцца з літаратурай па інфарматыцы, сродках праграміравання, базах даных, Інтэрнэце, тэкставых працэсарах і іншых аперацыйных праграмах.

*В.Ф. ЛЮБАЛЬ,*
*вядучы бібліятэкар*

# *Дапамогуць базы даных*

*Фундаментальная бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта запрашае выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў і навуковых супрацоўнікаў азнаёміцца з поўнатэкставымі базамі даных на CD-ROM кампаніі EBSCO.*

**База даных па бізнесе і эканоміцы** (Business Source Premier) (1984 – кастрычнік 2000) прапануе вялікі збор часопісаў па эканоміцы і бізнесе ад 1990 года. Яна змяшчае поўны тэкст больш за 1320 часопісаў (у тым ліку Harvard Business Review, Academy of Management Review і многіх іншых навуковых часопісаў па кіраванні, эканоміцы і іншых галінах бізнесу), а таксама рэфераты і анатаваныя паказальнікі больш за 2000 дзелавых часопісаў (у тым ліку The Wall Street Journal).

**Медыцынская база даных** (MEDLINE) (1966 – май 2000) з'яўляецца вядучай базай даных, прысвечанай усім галінам медыцыны і біямедыцынскіх даследаванняў. Яе вядзе Нацыянальная медыцынская бібліятэка ЗША. У базе ёсць поўны набор анатацыяў Medline, пачынаючы з1966 года да цяперашняга часу, спасылкі на артыкулы ў Medline да адпаведных поўных тэкстаў артыкулаў, надрукаваных у больш чым 80 вядучых медыцынскіх часопісах, а таксама поўны тэкст часопісаў ад 1990 года.

**База даных штодзённых газет** (Newspaper Source) (1995 – ліпень 2000) змяшчае больш за паўмільёна артыкулаў з англамоўных газет мноства краінаў свету.

**База даных навуковых часопісаў** (Academic Search Elite) (1984 – кастрычнік 2000) – гэта адзін з самых поўных збораў навуковых часопісаў. У яе ўваходзяць поўныя тэксты больш за 1230 часопісаў (многія выданні – пачынаючы з 1990 года), рэфераты і анатаваныя паказальнікі больш за 3000 навуковых часопісаў, сярод якіх многія выданні – з 1984 года.

**База даных папулярнай перыёдыкі** (Public Library) (1984 – ліпень 2000) арыентуецца на патрэбы публічных бібліятэк і складаецца з часопісаў на агульныя тэмы, уключна з тэмамі бізнесу, палітыкі, здароўя, мастацтва і культуры. Яна змяшчае поўны тэкст больш за 1810 часопісаў, пачынаючы ад 1990 года, а таксама рэфераты і анатаваныя паказальнікі больш чым 2780 часопісаў, пачынаючы з 1984 года.

**База даных навукова-папулярнай перыёдыкі** (Magazine Article Summaries) (1984 – кастрычнік 2000) з'яўляецца зборам часопісаў агульнага характару, пачынаючы з 1984 года. Яна змяшчае поўны тэкст больш чым 400 часопісаў, сярод якіх – многія выданні з 1990 года, а таксама рэфераты і анатаваныя паказальнікі, у тым ліку Magill Book Reviews.

Усе часопісы і іншыя інфармацыйныя крыніцы прадстаўленыя ў базах даных па-англійску. Пазнаёміцца з імі можна ў зале інфармацыйнага абслугоўвання (галоўны корпус, аўд. 231). Час працы: панядзелак, аўторак, серада, чацвер – 9.30–17.00, пятніца – 9.30–16.00. Апрача таго, можна папярэдне запісацца па тэл. 209-50-82.

*Алена ДЗІЕСПЕРАВА,*
*бібліятэкар*

**ЗНАЁМЦЕСЯ**

# Студэнт, які выбірае правілы гульні

Вадзім Зубрыцкі, студэнт чацвёртага курса геаграфічнага факультэта, — даволі цікавая асоба. І здзівіў ён усіх у рэдакцыі ў першую чаргу тым, што пачаў актыўна, без ніякага прымусу, супрацоўнічаць з намі. Прычым, удала. Кожны раз, калі Вадзім з'яўляецца ў нашым пакоі — гэта новыя ідэі адразу з парога, гэта цэлы шквал энергіі і аптымізму. Здаецца, гэтага хлопца цікавіць літаральна ўсё, дый сам ён на многае здольны. У яго кожная новая думка знаходзіць практычнае рашэнне. Ну, а прага да паста-



На рыбалцы

яннага дзеяння робіць яе яшчэ больш рэальнай.

Калі мы пазнаёміліся з Вадзімам бліжэй, ён падаўся нам яшчэ больш цікавым і markрознабаковым.

Вадзім жыве паводле прынцыпу: калі можаш сам зрабіць нейкую справу — не звальвай яе на іншага. Таму ён заўсёды робіць больш, чым ад яго патрабуюць. Вадзім не толькі добра здае экзамены, але з зацікаўленасцю падыходзіць да вывучэння экалогіі, хоць бы таго ж Маладзечна, у якім нарадзіўся. У яго цудоўная калекцыя фотаздымкаў азёр Беларускага Паазер'я: Нарачанскай групы, Браслаўскіх азёр, якія ён зрабіў сам. Ён любіць вандраваць.

Рознабаковасцю захапленняў Вадзім вылучаўся яшчэ са школьных гадоў. Рыбалка для яго была не толькі адпачынкам. Рыбы яго цікавілі як жывыя істоты. Ён вывучаў іх характар і звычкі і ўсё, што іх атачае. Шмат чытаў па біялогіі. А па геаграфіі заўсёды займаў першыя месцы ў гарадскіх алімпіядах. Як ні парадаксальна, Вадзім займаўся ў філалагічным класе і неаднаразова перамагаў з сачыненнямі ў гарадскіх конкурсах юных талентаў. А ў 1997 годзе нават заняў другое месца на абласным конкурсе са сваім фантастычным апавяданнем "Таленавіты аматар"...

"Хто такі гэты твой таленавіты аматар?" — пытаюся ў Вадзіма.

"Гэта чалавек, які дзейнічае нестандартна, насуперак усталяваным правілам і фармальнай логіцы. А таленавіты ён таму, што можа дамагчыся пастаўленай мэты нават не кіруючыся прынятымі правіламі гульні. Ён дзейнічае па сваіх перакананнях і сумленні, не парушаючы пэўных этычных нормаў."

Тое, што ў Вадзіма інтарэсы часам падаюцца кардынальна супрацьлеглымі, не гаворыць, што ён раскідвае сваю ўвагу. Вадзім стараецца ўсё максімальна спланаваць. Але заўсёды пры гэтым пакідае сабе прастору для так званага "манеўру". Ён лічыць за лепшае мець некалькі варыянтаў, каб потым можна было спыніцца на адным. Напрыклад, пасля заканчэння школы перад Вадзімам стаяла дылема: выбраць журфак ці іхтыялагічны факультэт. Перамагла цікавасць да рыб. І паколькі ў нашай рэспубліцы няма адпаведнага факультэта, Вадзім спыніў сваю ўвагу на геаграфічным.

Ён добра ведаў, на што ідзе. Такія прадметы, як агульная фізіка, вышэйшая матэматыка, па якіх ён сёння вымушаны здаваць экзамены, можа і не вельмі вабяць, але рыхтуецца ён да іх з усёй адказнасцю.



Чытаючы ўлюбёную газету

Наогул, Вадзім адказны хлопец. Можа, таму ў аддзеле па ахове жывёльнага свету, рыбных запасаў і запаведных тэрыторый Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дзе ён праходзіў практыку, яму заўсёды рады.

Вадзім гаворыць пра сябе, што ён ніколі нікому не зайздросціць. Чаму? Ды таму, што ён упэўнены: калі чалавек нечага дасягнуў — значыць, ён прыклаў для гэтага шмат намаганняў і заслугоўвае павагі.

Вядома, і ў Вадзіма, як ва ўсіх, бываюць няўдачы. Але ён не можа прыгадаць сітуацый, якія б маглі поўнасцю выбіць яго з каляіны. Каб не трапіць у тупік, хлопец стараецца не зацыклівацца на чымсьці адным, тым больш, калі яно не прыводзіць да нейкіх вынікаў.

Вадзім лічыць, што ў яго ёсць сапраўдныя сябры, якія могуць прыйсці на дапамогу. Шмат прыяцеляў ён не заводзіць: "Лепш мець аднаго добрага таварыша, чым дзесяць, якія кінуць цябе ў цяжкую хвіліну".

Можа, і трэба любіць усё сапраўднае, каб быць сапраўдным студэнтам. А як лічыце вы?

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

**СПОРТПЛЯЦОЎКА**

# Юрысты заўсёды першыя

Не так даўно ў нашым універсітэце прайшлі спаборніцтвы па грэка-рымскай барацьбе, у якіх удзельнічалі 120 чалавек з 10 факультэтаў. Месцы паміж удзельнікамі былі падзелены наступным чынам:

1 месца — юрфак,
2 месца — геафак,
3 месца — фізфак,
4 месца — радыёфізічны факультэт,
5 месца — ФПМІ,
6 месца — ММФ,
7 месца — біяфак,
8 месца — хімфак,
9 месца — гістфак,
10 месца — ФФСН.

У асабістым першынстве ў вагавай катэгорыі да 54 кг перамог Аляксандр Амількові (юрфак), да 58 кг — Сяргей Шпак (геафак), да 63 — Аляксандр Белякоўскі (юрфак), да 69 кг — Аляксандр Кікінеў (геафак), да 76 кг — Рыгор Абуладзе (фізфак), да 85 кг — Дзмітрый Круглік (геафак), да 97 кг — Шота Нармані (геафак), да 130 кг — Аляксей Філістовіч (юрфак).

***

У снежні прайшло першынство БДУ па баскетболе сярод жанчын, у якім прынялі ўдзел 127 чалавек з 13 факультэтаў. Факультэты занялі наступныя месцы:

1 месца — юрфак,
2 месца — ФПМІ,
3 месца — геафак,
4 месца — мехмат,
5 месца — хімфак,
6 месца — ФМА,
7 месца — журфак,
8 месца — гістфак,
9 месца — біяфак,
10 месца — філфак,
11 месца — ФФСН,
12 месца — фізфак,
13 месца — эканамічны факультэт.

*Надзея БАЛДЗІНА*

*ЗАЦВЕРДЖАНА*
*загадам па Белдзяржуніверсітэце*
*ад 17 студзеня 2001 г. № 10-ПС*

# ПАЛАЖЭННЕ АБ АЛІМПІЯДАХ «АБІТУРЫЕНТ БДУ-2001» БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

## 1. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ АЛІМПІЯД

Беларускі дзяржаўны універсітэт — арганізатар алімпіяд «Абітурыент БДУ-2001» — ставіць мэтай:

— забяспечыць якасны набор абітурыентаў на фізіка-матэматычныя і эканамічныя спецыяльнасці універсітэта;

— прыцягнуць да ўдзелу ў алімпіядах як мага большую колькасць моладзі, якая цікавіцца матэматыкай, механікай, фізікай, электронікай, інфарматыкай і эканомікай;

— выявіць па-сапраўднаму здольных, захопленых і працалюбівых маладых людзей, якія валодаюць не толькі добрай алімпіяднай падрыхтоўкай (арыгінальнасцю мыслення, хуткай кемлівасцю), але і здольнасцю да штодзённай руплівай працы;

— унесці ў характар правядзення алімпіяд прафарыентацыйныя і навучальныя моманты.

## 2. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АЛІМПІЯД

2.1. У 2001 годзе ў БДУ праводзяцца наступныя алімпіяды:

— па матэматыцы (механіка-матэматычны факультэт);

— па матэматыцы і інфарматыцы (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі);

— па матэматыцы і эканоміцы (эканамічны факультэт);

— па фізіцы (фізічны факультэт);

— па фізіцы і інфарматыцы (факультэт радыёфізікі і электронікі).

2.2. Алімпіяды праводзяцца ў лютым—маі бягучага навучальнага года. Адказнасць за правядзенне кожнай з іх ускладаецца на аргкамітэт, які ўзначальваецца дэканам адпаведнага факультэта і склад якога зацвярджаецца рэктарам БДУ. Аргкамітэт ажыццяўляе ўсе арганізацыйныя мерапрыемствы па правядзенні алімпіяды, займаецца падрыхтоўкай заданняў і праверкай работ першага і другога тураў алімпіяды, уносіць прапановы па вызначэнні пераможцаў і прызёраў па выніках трэцяга тура.

2.3. Алімпіяды праводзяцца ў тры туры. Першы тур (завочны) праводзіцца з публікацыяй умоў правядзення алімпіяд і заданняў у рэспубліканскім перыядычным друку. Другі і трэці туры — вочныя. Другі тур праводзіцца ў Белдзяржуніверсітэце або ў абласных цэнтрах рэспублікі. Трэці тур праводзіцца ў Белдзяржуніверсітэце 13 мая 2001 года адпаведнымі прадметнымі экзаменацыйнымі камісіямі шляхам выканання пісьмовых работ.

2.4. У першым туры алімпіяд могуць удзельнічаць вучні выпускных класаў сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў, навучэнцы выпускных курсаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў або ПТВ.

Да другога тура алімпіяд допускаюцца пераможцы першага тура і вучні выпускных класаў ліцэя БДУ, а да трэцяга — пераможцы другога тура. Без папярэдняга адбору да трэцяга тура допускаюцца пераможцы абласных і Мінскай гарадской алімпіяд школьнікаў, удзельнікі заключнага этапа рэспубліканскіх алімпіяд школьнікаў па матэматыцы, фізіцы, астраноміі, інфарматыцы, якія праводзяцца Міністэрствам адукацыі, а таксама пераможцы рэспубліканскіх турніраў юных матэматыкаў і фізікаў, пераможцы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі школьнікаў па матэматыцы і фізіцы, пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд сярод навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па матэматыцы і інфарматыцы, пераможцы рэспубліканскага конкурсу "Абітурыент Беларусі-2001", пераможцы рэспубліканскага вочна-завочнага конкурсу па матэматыцы і інфарматыцы сярод сельскіх школьнікаў.

2.5. Удзел у першым туры алімпіяд платны. Кошт удзелу — 3100 рублёў. Грошы адпраўляюцца паштовым або банкаўскім пераводам з паметкай "Алімпіяда" на адрас: 220050, г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, разліковы рахунак 3622204930033 у Мінскай гарадской дырэкцыі ААТ "Белбізнесбанк", код 764. Жадаючыя могуць ажыццявіць аплату непасрэдна ў разліковa-касавым цэнтры Белдзяржуніверсітэта (вул. Кастрычніцкая, 10, тэл. 229-25-90). Квітанцыя аб аплаце высылаецца або здаецца разам з работай першага тура.



*У лабірынтах ведаў*

## 3. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ВЫЗНАЧЭННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ АЛІМПІЯД

3.1. Колькасць і персанальны склад удзельнікаў алімпіяды, якія допускаюцца да кожнага наступнага тура, вызначаюцца адпаведным рашэннем аргкамітэта.

3.2. Па выніках трэцяга тура аргкамітэт уносіць прапановы па колькасным і персанальным складзе пераможцаў і прызёраў алімпіяды, якія зацвярджаюцца рашэннем прыёмнай камісіі.

3.3. Вучням выпускных класаў сельскіх школ, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці, па рашэнні прыёмнай камісіі пры падвядзенні вынікаў алімпіяд могуць налічвацца дадатковыя балы.

3.4. Пераможцы алімпіяды па матэматыцы атрымліваюць права на залічэнне без уступных экзаменаў пры паступленні на ўсе спецыяльнасці механіка-матэматычнага факультэта.

3.5. Пераможцы алімпіяды па матэматыцы і інфарматыцы атрымліваюць права на залічэнне без уступных экзаменаў пры паступленні на ўсе спецыяльнасці факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

3.6. Пераможцы алімпіяды па матэматыцы і эканоміцы атрымліваюць права на залічэнне без уступных экзаменаў пры паступленні на ўсе спецыяльнасці эканамічнага факультэта.

3.7. Пераможцы алімпіяды па фізіцы атрымліваюць права на залічэнне без уступных экзаменаў пры паступленні на ўсе спецыяльнасці фізічнага факультэта.

3.8. Пераможцы алімпіяды па фізіцы і інфарматыцы атрымліваюць права на залічэнне без уступных экзаменаў пры паступленні на спецыяльнасці «Радыёфізіка», «Фізічная электроніка» факультэта радыёфізікі і электронікі.

3.9. Прызёры алімпіяд па матэматыцы, матэматыцы і інфарматыцы, фізіцы, фізіцы і інфарматыцы прымаюцца на адпаведныя факультэты на ўмовах, прадугледжаных "Правіламі прыёму ў БДУ на 2001 год" для асоб, якія скончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём.

3.10. Прызёрам алімпіяды па матэматыцы і эканоміцы можа быць выстаўлена экзаменацыйная адзнака "9" або "10" па матэматыцы (у залежнасці ад колькасці балаў, набраных імі ў трэцім туры).

3.11. Ільготамі пры залічэнні пераможцы і прызёры алімпіяд «Абітурыент БДУ-2001» карыстаюцца толькі ў год іх правядзення.

# З днём нараджэння, Ліцэй БДУ!

На пачатку лютага Ліцэй БДУ будзе святкаваць свой дзень нараджэння. Традыцыйна будуць наладжаныя Дні Ліцэя. У іх праграме запланавана навукова-практычная канферэнцыя, якая пройдзе 1 лютага ў 9.00 у будынку Ліцэя (вул. Маякоўскага, 96), а таксама Кірмаш вучнёўскіх ідэй, які пачнецца 2 лютага ў 10.00 тамсама. Апрача таго, 2 лютага ў ПК "МАЗа" адбудзецца ўрачыстая вечарына (пачатак у 17.00). Завершыць святкаванне спартыўнае свята, якое пройдзе 3 лютага на базе спартыўнага комплекса БДУ ў 10.00.

# Выпускнікі Ліцэя – 2000

З 240 выпускнікоў Ліцэя паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы 239, прычым 212 – у БДУ!

Найбольшая колькасць выпускнікоў апынулася на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (58 чалавек). Другое месца дзеляць паміж сабой філалагічны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі (па 26 чалавек). На трэцім – хімічны факультэт (18 чалавек).

27 выпускнікоў паступілі ў іншыя навучальныя ўстановы, у тым ліку і па-за межамі Беларусі (МДУ, МФТІ, ЛДУ).

# Ліцэісты – пераможцы міжнародных алімпіяд 2000 года

На міжнароднай алімпіядзе па матэматыцы ў Паўднёвай Карэі Аляксандр Усніч (11 М-1 клас) атрымаў залаты медаль, Аляксандр Кіркоўскі (11 М-1 клас) – срэбраны.

На міжнароднай алімпіядзе па хіміі ў Даніі Юрый Галаўко (11 Х клас) атрымаў залаты медаль, Павел Паляшчук (11 Х клас) – срэбраны, Аляксей Аляксееў (11 Х клас) – бронзавы.

На міжнароднай алімпіядзе па біялогіі, што праходзіла ў Турцыі, Аляксандр Яноўскі (10 Х-Б клас) атрымаў срэбраны медаль, Сяргей Прыхожы (11 Х-Б клас) – бронзавы.

На міжнароднай алімпіядзе па фізіцы ў Англіі Аляксандр Міхнюк (11 Ф-2 клас) атрымаў пахвальны водгук.

На міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы, якая праходзіла ў Кітаі, Аляксей Кіркоўскі (11 М-1 клас) атрымаў срэбраны медаль.

За ўдзел у рэспубліканскіх алімпіядах у 2000 годзе ліцэісты атрымалі 63 дыпломы і 21 пахвальны водгук.




## НАТАТНІК ЛІЦЭІСТА

*Юлия ДУБОВИК,*
*выпускница Лицея 1997 года*

***

Небо плачет...
Смотрите же, оно плачет...
...проливает на нас свое соленое горе,
А мы спешим куда-то, о чем-то спорим.
И говорим, что дождь, что плохая погода,
Что лето не скоро и еще полгода
Носить теплые пальто и шубы.

А небо одинокое, оно потерялось,
Оно не помнит, кто оно и откуда,
Смотрит и думает:
"Найдется ли кто-нибудь,
Кто закроет зонтик?"

*Надежда ГУСАКОВСКАЯ,*
*выпускница Лицея 1997 года*

### Молитва

Пятипалые ладони –
Распущу.
Оперение на них –
Распушу.
И в полет к звезде Земле
Я пущусь.
И молитву прошепчу –
Наизусть:
Прости за талант неумелый,
За пошлость в высоком звучании,
За голос в глубоком молчании,
За старость в юности смелой.

## СЛОВА – ЛІЦЭІСТУ

*Василий МАТВЕЕВ,*
*выпускник Лицея 1999 года*

# Будущее принадлежит молодым

Это я иду по проспекту, буквально утопая в широких штанах с большими карманами на боку, гордо неся коротко постриженную голову, не обращая никакого внимания на зевак, подолгу с иронией смотрящих вслед. Это я на бешеной скорости в шлеме и подлокотниках мчусь на роликах по гладкому асфальту или выделываю головокружительные трюки на рампе, в любой момент рискуя свернуть шею. Это я сиднем сижу в Национальной библиотеке с очками на носу, углубившись в чтение и потеряв всякую связь с внешним миром. Это опять я, щеголеватый баловень с папочкой под мышкой, прогуливаюсь по скверу, ощущая на себе недвусмысленные взгляды длинноногих красавиц. И этот неизменный "я", которого не устают называть "молодым человеком", "парнем", "юношей", который лелеет грандиозные мечты, планирует будущую жизнь, конечно же не забыв предварительно надеть розовые очки, счастлив. Этот самый "я", который пока еще верит в человеческую честность, совестливость и порядочность, правду и справедливость, сострадание и гуманность, которого еще не заставить выбирать – оставаться ли человеком в нечеловеческих условиях, входит в ту чудесную пору своей жизни, прелесть которой состоит как раз не в возможности все сделать, а в возможности думать, что все сделаешь.

Наше поколение не строило баррикад, не поднимало целинных земель, не бросалось на амбразуру дота. Поколение "next" выбрало для себя другие ценности: жвачку, "колу", баксы... Свободную от обязательств разума и сердца "любовь", танцы до упаду на заплеванном жвачкой "танцполе", похвальбу очередной шмоткой, презрение к трудовым мозолям. И равнодушие, равнодушие к завтра, потому что сегодня заполнено до отказа низкопробной "попсой", "шмалью", "видаком". Все это банальная, пошлая погоня за бездуховным, чужим стандартом, бегство в мир вещей под маркой цивилизации.

Обидно, что такая богатая страна сама себя унизила, сдавшись без боя. Иномарки, бытовая техника, аудио- и видеоаппаратура в одночасье заполонили рынок. Сейчас для того, чтобы завоевать авторитет у сверстников, не надо переворачивать горы научной литературы – не оценят, да и паять ночами приемники – занятие неблагодарное. Достаточно пахнуть туалетной водой, скажем, от "Hugo Boss", носить номерные туфли от "Marcopizza". И ты калиф на час! Что впереди у поколения, выбравшего "пепси"? Новый чужой стандарт? Но для начала нужно остановиться, создать свой стандарт, свою идеологию и культуру.

Пора, наконец, определиться с выбором цели: куда нам плыть? Ведь мучительное блуждание взрослых в потемках "светлого будущего" – это еще не самое страшное. Страшнее, когда детство несется по жизни "без руля и ветрил" и попадает в опасные водовороты...

...Наверное, все-таки главным для грядущих поколений является человек, идущий в знание и мастерство. Он будет востребован...

# ПРАСІСЯ Ў КАЛЕКТЫЎ

Пасля заканчэння інстытута, уладкоўваючыся на прэстыжную працу, хочацца як мага лепш выглядаць перад працадаўцам. Ну і, зразумела, выстаўляеш напаказ усе свае лепшыя якасці, нават пыл у вочы пускаеш — толькі б прынялі... Аднак сустракаешся з немалой доляй скепсісу: маўляў, навічок у справе, не маеш практыкі. Не губляйся — ўсе гэтыя навыкі ў цябе хутка з'явяцца, калі трапіш... у калектыў.

Міхаіл Літвак, вядомы ў Расіі і па-за яе межамі аўтар псіхалагічных бестселераў, лічыць, што не кожны калектыў адпавядае гэтаму слову. Поўнай супрацьлегласцю калектыву з'яўляецца, паводле вызначэння навукоўца, кааперацыя, дзе пераважаюць інтрыгі і канфлікты. І тады ў навукова-даследчых інстытутах — не да навукі, у школах — не да вучняў, у бальніцах — не да хворых. Гэта варта ведаць, каб выбіралі не толькі вас, але і вы выбіралі... У калектыве вам дапамогуць развіць лепшыя якасці і стаць добрым спецыялістам, у кааперацыі ж усе намаганні давядзецца сканцэнтраваць на абароне свайго месца пад сонцам.

Калектыў, на мове навукі, — гэта такі ўзровень групы, пры якім яе член можа ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля інтарэсаў групы і праз інтарэсы групы рэалізоўваць свае ўласныя інтарэсы.

Крыху груваcткае азначэнне, так? Каб стала больш зразумелым, паназірайце за гульнёй вашых улюбёных футбалістаў.

Першы варыянт: футбаліст А знаходзячыся ў выгаднай пазіцыі, забівае гол. Але ў больш выгаднай пазіцыі знаходзіўся яго таварыш, усё ж пас яму А не паслаў. Другі варыянт: футбаліст А знаходзіцца ў выгаднай пазіцыі. Яго таварыш знаходзіцца ў яшчэ больш выгаднай пазіцыі. І ён замест таго, каб забіць гол саму, робіць пас таварышу, які і забівае без лішняй рызыкі гол.

Як вы думаеце, дзе калектыў? Няцяжка здагадацца, што ў другім выпадку. У першым — перад намі кааперацыя, дзе члены групы вырашаюць толькі свае задачы. На групу футбалісту А наплюваць. Калі каманда вылеціць з вышэйшай лігі, то яму (бо ён забівае галы) гэта нічым не пагражае. Ён пяройдзе ў іншую каманду. На жаль, калектывы сустракаюцца настолькі рэдка, што многія не ведаюць, што такое сапраўдны калектыў, і думаюць, што працуюць менавіта ў калектывах.

Між тым, вельмі важна ведаць, на якім узроўні развіцця знаходзіцца група, членам якой ты з'яўляешся, якой кіруеш або ў якую збіраешся ўступіць, бо паміж кааперацыяй і калектывам ёсць істотныя адрозненні.

Кааперацыя ў цяжкія часы распадаецца, а калектыў з'ядноўваецца. У кааперацыі не ўзнікае сяброўскіх эмацыянальных сувязей. Выхад з кааперацыі звычайна азначае і разрыў з людзьмі, з якімі раней працаваў. Знаходжанне ў калектыве робіць працу радаснай. Калі даводзіцца па тых або іншых прычынах выйсці з калектыву, эмацыянальныя сувязі захоўваюцца, і нават пасля доўгай адсутнасці цябе там сустрэнуць з радасцю. У цяжкія хвіліны туды можна пайсці па дапамогу. Кааперацыя, калі яна не ператвараецца ў калектыў, становіцца карпарацыяй, істотнай прыкметай якой з'яўляецца групавы эгаізм. Паміж сабой яе члены могуць знаходзіцца ў варожых адносінах, але з'ядноўваюцца, калі ў іх асяроддзе спрабуе пранікнуць чужы. Трапіць у члены карпарацыі вельмі цяжка, аднак калі гэта ўдалося, то можна перастаць турбавацца пра свой службовы рост. Галоўнае — не супярэчыць карпаратыўным нормам.

Калектыў — адкрытая сістэма. Трапіць у яго лёгка. Становішча ў калектыве вызначаецца асабістай кампетэнтнасцю, і старыя знаёмствы, заслугі і сяброўскія сувязі не дапамогуць ўтрымацца на ранейшым месцы. Але, з другога боку, калі ты спатыкнуўся, цябе не затопчуць, як у карпарацыі, а дапамогуць падняцца. І наогул, адставанне — не ганьба.

Прыкладаў таму шмат.

Многія людзі з вялікай цяжкасцю ўзгадваюць сваіх аднакласнікаў. І калі гэта была кааперацыя, успамінаюць толькі ворагаў. Ад калектыву застаюцца ўспаміны, што там былі толькі сябры. Многія не памятаюць таварышаў па службе, з якімі працавалі доўгія гады. Значыць, працавалі ў кааперацыі. Той, хто працуе ў кааперацыі, заўсёды адчувае сябе часовым і шукае новае месца работы, хоць у выніку можа адпрацаваць тут вельмі доўга.

На жаль, многія людзі не ведаюць, што такое калектыў, і ўпершыню ў сваім жыцці пачынаюць гэта ўсведамляць занадта позна. Для многіх жа — гэта толькі словы. Проста словы...

*Падрыхтавала*
*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

ІНІЦЫЯТЫВА

# ПСІХОЛАГІ АДКАЖУЦЬ ПРАЗ ГАЗЕТУ

Ужо не першы год у нашым універсітэце існуе псіхалагічная служба. Сюды можа звярнуцца кожны, хто хоча вырашыць набалелыя праблемы — адносіны з сябрамі і сваякамі, няўпэўненасць, адаптацыя да новых умоваў жыцця ў інтэрнаце пасля хатняй утульнасці... Дый ці мала ў кожнага з нас клопатаў?

Праўда, не ўсім даспадобы ісці да псіхолага — трэба гаварыць з чужым чалавекам пра свае праблемы. А на гэта, вядома, не кожны насмеліцца.

Рэдакцыя газеты "Беларускі універсітэт" разам з псіхалагічнай службай БДУ прапануе бясплатную псіхалагічную дапамогу. Дасылайце на наш адрас лісты (не адзначаючы сваё прозвішча і каардынаты) — псіхалагічная служба БДУ адкажа вам праз газету.

АКТУАЛЬНА

# *Рост сусветнай эканомікі працягнецца*

Паводле даклада ААН "Сусветнае эканамічнае становішча і перспектывы на 2001 год", які выйшаў на мяжы гадоў у Нью-Йорку, працэс паскоранага аднаўлення пасля фінансавых узрушанняў, якія адбыліся ў свеце ў 1997 і 1998 гадах, пастунова слабее, аднак глабальная эканамічная экспансія працягнецца ў 2001 годзе сярэднімі тэмпамі.

Паводле прагнозаў экспертаў, якія падрыхтавалі даклад, тэмпы росту сусветнага ўнутранага нацыянальнага прадукту (УНП) у 2001 годзе складуць 3,5 %, у той час як у 2000 годзе яны складалі 4 %.

Аўтары даклада ўказваюць на тое, што магчымае запавольванне будзе звязана з тэндэнцыямі 2000 года, кшталту высокіх цэнаў на нафту і змяншэнне рынкаў працы, якія прыводзілі да інфляцыі, змушаючы людзей, што прымаюць рашэнні, здзяйсняць надзвычайныя абмежавальныя меры. Сярод іншых фактараў можна назваць высокія працэнтныя стаўкі, хуткае ўмацаванне долара адносна іншых валют, падзенне карпаратыўных прыбыткаў і ўзрастанне пазык.

У той самы час у дакладзе ёсць перасцярогі адносна ўзнікнення новых эканамічных пагроз, выкліканых вялікімі дысбалансамі ў буйных эканоміках, нервовасцю міжнародных інвестараў і нестабільнасцю на фінансавых і фондавых рынках. Эксперты ААН таксама папярэджваюць, што чарговае павышэнне коштаў на нафту ў кантэксце зніжэння тэмпаў эканамічнага росту ў 2001 годзе можа прымусіць валютныя інстытуты ўтрымліваць працэнтныя стаўкі на больш высокім узроўні, чым гэта неабходна.

Як паведамляецца ў дакладзе, інвестыцыйныя выдаткі на камп'ютэрнае абсталяванне і праграмнае забеспячэнне, Інтэрнэт і тэлекамунікацыі працягнуць стымуляваць глабальную эканоміку на працягу бліжэйшых некалькіх гадоў, аднак не на такім высокім узроўні, як гэта было ў мінулыя гады.

У Злучаных Штатах Амерыкі, якія лідзіравалі сярод развітых краінаў з 5-працэнтным узроўнем росту валавага нацыянальнага прадукту ў 2000 годзе, прагназуецца зніжэнне росту да 3,5 % у 2001 годзе. Рост УНП Японіі ўзрасце з 1,2 % у 2000 годзе да 2 % у 2001 годзе. Рост УНП краінаў Еўрапейскага Саюза, што быў на ўзроўні 3,4 %, крыху знізіцца, дасягнуўшы адзнакі 3 %.

Рост УНП ва ўсіх краінах, якія развіваюцца, дасягаў у 2000 годзе 5,6 %, ён захаваецца практычна на ранейшым узроўні (5,5 %). Краіны з пераходнай эканомікай дасягнуць узроўню ў 4 % у 2001 годзе ў параўнанні з 5,5 % у 2000 годзе.

*Па матэрыялах*
*Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

# Першы даследчык Сібіры

*У мінулым годзе споўнілася 365 гадоў з дня нараджэння Адама Длужыка-Каменскага (1635—1672), выдатнага падарожніка, аўтара першага ў Еўропе географа-этнаграфічнага апісання Сібіры.*

Нарадзіўся Адам Каменскі ў сям'і аршанскага шляхціца ў 1635 годзе. Як і належыць тагачаснаму шляхціцу, асноўным сваім заняткам ён абраў ваенную справу — быў латнікам (рыцарам) панцырнай кавалерыі Рэчы Паспалітай. У канцы лістапада 1660 года ў час бітвы з маскоўскімі войскамі на рацэ Басі (паміж Магілёвам і Шкловам) Каменскі трапіў у расійскі палон. Доля палоннага — незайздросная: у лютым 1661 года ён быў адпраўлены з Масквы ў Сібір для прымусовай службы ў сібірскім войску.

Табольск, даліны Іртыша, Абі, Енісея... Потым Енісейск, рэкі Ангара і Лена, горад Якуцк. Гэтая доўгая нялёгкая дарога заняла не адзін год — у Якуцк Каменскі трапіў толькі ў сярэдзіне жніўня 1662 года. Неспакойная служба ў казацкіх войсках на велізарных абсягах Усходняй Сібіры заносіла Каменскага на Амур, у даліну Індыгіркі і нават на ўзбярэжжа Ледавітага акіяна. Зрэшты, не ўвесь час Адаму Длужыку даводзілася вандраваць: з канца 1664 года і да вясны 1668 года жыццё яго было аселым — ён служыў у Якуцку начальнікам тамтэйшай турмы.

Вялікая палітыка вырашае не толькі лёс краінаў і кантынентаў, яна ўплывае і на людскія лёсы. У канцы студзеня 1667 года паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй было заключана Андрусаўскае перамір'е (па назве вёскі Андрусава пад Смаленскам), якім скончылася вайна 1654—1667 гадоў. Паводле ўмоваў гэтага перамір'я, вярталіся дадому палонныя, сярод якіх быў і Длужык-Каменскі. Увесну 1668 года яго адпусцілі з Якуцка ў Маскву, куды ён дабіраўся амаль год. І ажно ў пачатку 1672 года палонны шляхціц вярнуўся ў Оршу.

У сябе на радзіме Адам Каменскі і склаў свой "Сібірскі дыярыуш" (што азначае — дзённік), які ўпершыню быў апублікаваны ў Польшчы толькі праз 200 гадоў — у Познані ў 1874 годзе. Па-беларуску ж гэты тэкст пабачыў свет яшчэ праз стагоддзе — у 1974 годзе. Гэта было першае геаграфічнае апісанне Сібіры, зробленае еўрапейцам.

У сваёй кнізе Каменскі апісаў чароўную сібірскую прыроду, прыгажосць рачных каньёнаў. Аднак асноўную ўвагу аддаў усё ж такі мясцоваму насельніцтву.

У кнізе ёсць цікавыя этнаграфічныя звесткі пра сібірскія народы — вагулаў (мансі), асцякоў (ханты), тунгусаў (эвенкаў) і вельмі грунтоўныя апісанні побыту якутаў. Аўтар распавядае пра іх вонкавы выгляд і вопратку, абсталяванне жытла, веранні і рытуалы. Вагулы, напрыклад, пасля таго, як заб'юць мядзведзя, плачуць над ім, прыгаворваючы, што забілі яго не яны, а лук; потым моляцца мядзведжай галаве, уладкоўваючы яе ў куце качэўя — гэта робіцца для таго, каб паляўнічыя пазбеглі помсты сваякоў забітага звера. Апісвае Адам Каменскі і жыццё тунгусаў Прыангарскай тайгі: іх паляванне і аленяводства, народныя гульні, нарты з запрэжкай сабак (на Ангары пры спрыяльным ветры тунгусы прыладкоўваюць ветразь і хутка кацяцца на нартах па гладкім лёдзе). Гэтыя людзі, па словах аўтара, "вельмі любяць сабак, маючы іх па некалькі дзесяткаў і соцень, ... на сабаках ездзяць, сабак ядуць, у сабачых шкурах ходзяць".

Длужык-Каменскі падрабязна апісвае нязвыклую для яго з'яву прыліву і адліву на беразе Ахоцкага мора, у вусці ракі Ламы: "У тую раку Ламу прыбывае гадзінаў дванаццаць мора, а ўбывае таксама дванаццаць гадзінаў. /.../ Застаюцца воды ў далінах, у равах, і значная колькасць марскіх рыб і ракаў, на дзіва вялікіх — досыць на аднаго чалавека 6 ці 7 ракаў, каб несціся. Мы іх варылі і запякалі". Распавядае падарожнік і пра вечную мерзлату: "Там ні адна рэч не ўродзіць, бо зямля адтайвае не больш чым на локаць".

Апісваючы пабудовы ў сібірскіх і ўральскіх гарадах (крэпасці, цэрквы, салярні, жылыя дамы), Адам Каменскі прыводзіць важныя звесткі, якіх няма ў іншых крыніцах. Напрыклад, дагэтуль першыя каменныя пабудовы ў Табольску датаваліся канцом XVII стагоддзя. Длужык-Каменскі ж кажа, што ён бачыў у Табольску "каменныя пабудовы" ўжо ў 1660-х гадах. З такіх звестак вынікае, што па кнізе нашага земляка можна рабіць сур'ёзныя высновы, значныя для сучаснай навукі.

Тым цікавейшымі здаюцца і новыя звесткі пра аўтара гэтага каштоўнага помніка. Так, на падставе архіўных дакументаў вядомы пецярбургскі гісторык навукі Б.П. Палявой удакладніў шэраг звестак, згаданых у польскім выданні "Дыярыуша", у прыватнасці месца і дату смерці Адама Длужыка (у польскім выданні казалася, што ён сканаў 29 студзеня 1667 года ў Нясвіжы; архіўныя ж дакументы сцвярджаюць, што Каменскі памёр пасля 1672 года і пахаваны ў Оршы). Пазнейшыя даследаванні пацвердзілі высокую дакладнасць этнаграфічнага апісання сібірскіх народаў аўтарам "Дыярыуша". Ён заўсёды акуратна запісваў тое, што бачыў на свае вочы.

Няма сумневу, што "Сібірскі дыярыуш" Адама Длужыка-Каменскага мае асаблівую каштоўнасць для даследчыкаў — ён складзены на пачатковым этапе славянскага асваення Сібіры. Таму ў 1996 годзе "Дыярыуш" аршанскага шляхціца быў перавыдадзены ў Польшчы з улікам апошніх паправак Б.П. Палявога.

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*



# Спецыялістаў заўсёды мала

Згодна з дакладам Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), нястача кваліфікаванай працоўнай сілы ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіяў (ІКТ) у Еўропе пагражае перарасці ў сур'ёзную праблему для пашырэння дзейнасці адпаведных галінаў прамысловасці.

Эксперты МАП перасцерагаюць, што ў той час як у прамысловасці еўрапейскіх краінаў, звязанай з інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, чакаецца штогадовы рост патрэбаў у працоўных месцах на 8 % у бліжэйшыя гады, колькасць незапатрабаваных вакансіяў у гэтай сферы можа павялічыцца ўтрая (з 500 тысяч чалавек у 1998 годзе да 1,6 мільёна чалавек у 2002 годзе). Паводле некаторых звестак, "дэфіцыт кваліфікаваных работнікаў прывядзе да стратаў валавага прадукту краінаў у памеры 106 мільярдаў долараў ЗША, пачынаючы з 1998 года, і гэтая тэндэнцыя можа працягнуцца ў наступныя гады".

Спецыялісты МАП прадказваюць, што рэвалюцыя ў сферы ІКТ прадаставіць магчымасці для многіх, але не для ўсіх 15 мільёнаў беспрацоўных Еўропы, бо "кваліфікацыя, патрэбная для новай працы, карэнным чынам адрозніваецца ад той, якую маюць гэтыя работнікі". Тэрміновая патрэба ў кваліфікаваных спецыялістах у сферы ІКТ азначае, што "існуе ціск з боку працадаўцаў з мэтай змякчэння іміграцыйных заканадаўстваў сваіх краінаў" — тэндэнцыі, якая дапамагае прымаючым краінам, але прыводзіць да "ўцечкі мазгоў" з пасылаючых краінаў.

У выпадку, калі такая нястача захаваецца, можа ўзмацніцца пераарыентацыя галінаў прамысловасці, бо фірмы, як правіла, схіляюцца да рынкаў працы, на якіх канцэнтруюцца такія спецыялісты, як праграмісты, тэхнічныя работнікі і аналітыкі сістэм, што, у сваю чаргу, прывядзе да колькасна яшчэ большага разрыву паміж тэхналагічна багатымі і беднымі рэгіёнамі ў Еўропе.

"Прадпрыемствы на ўсім кантыненце сутыкаюцца з гэтай праблемай, аднак не існуе эканамічнай сферы, дзе б можна было адпачываць на лаўрах", — сказаў генеральны дырэктар МАП Хуан Самавія. "Рэвалюцыйныя змены ў галіне інфармацыі змяняюць як самі праблемы, так і іх вырашэнне, адказы могуць быць рознымі, але галоўнае пытанне застаецца аднолькавым для ўсіх: сацыяльны і эканамічны прагрэс наўпрост залежыць ад паспяховага ўдзелу ў "эканоміцы ведаў", — дадаў ён.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, эксперты, якія падрыхтавалі даклад, адзначаюць, што "падключанасць" да Інтэрнэту сярод еўрапейскіх краінаў і электронны гандаль будуць пашырацца надзвычай хуткімі тэмпамі. У Еўропе налічваецца каля 50 мільёнаў карыстальнікаў Інтэрнэту, пры тым што выкарыстанне яго ў Еўропе адбываецца "значна хутчэй, чым у кожным іншым рэгіёне свету". Колькасць карыстальнікаў Інтэрнэту на працоўных месцах у краінах Еўропы да 2004 года ўзрасце з 29 мільёнаў да 77 мільёнаў чалавек, паведамляецца ў дакладзе.

*Па матэрыялах*
*Прадстаўніцтва ААН*
*у Беларусі*

# *Мой гаспадар – Змяіны Цар...*

*Паводле ўсходняга календара, як вядома, 2001 год лічыцца годам Змяі. Аднак Усход – Усходам, але ж цікава было б даведацца, як ставіліся да змяі ў старажытнасці нашыя продкі.*

“Мой гаспадар — Змяіны Цар...” — напісаў у сваім вершы Анатоль Сыс. Гэтыя словы гучаць нібы запрашэнне ў чароўны свет нашых продкаў, дзе людзі пакланяліся святым камяням і не менш святым жывёлам.

Змеі займалі асаблівае месца ў гэтым пантэоне. Кажуць, што яны былі ў нейкай ступені... дамавікамі. Дакладней, дамавік паходзіў ад змяі. І таму хатнія змеі (пераважна вужы) лічыліся гарантамі шчасця і дабрабыту. Нездарма вядзьмаркі для таго, каб нашкодзіць гаспадарам жытла, імкнуліся выгнаць з яго ўсіх вужоў і гадзюк, на што наракалі беларускія сяляне. А ў летапісах згадваецца той факт, што ў 1387 годзе вялікі князь літоўскі Ягайла загадаў вынішчыць “вужоў і га-



даў, што меліся ў кожнай хаце”. Гэты загад выклікаў тады вялікае абурэнне па ўсёй дзяржаве — змеі нават у сярэднявечныя хрысціянскія часы шанаваліся не менш, чым у старажытныя паганскія. Але загад ёсць загад — змеяў, нібыта, вынішчылі. Праўда, больш чым праз стагоддзе падарожнік Сігізмунд Герберштэйн адзначаў, што ўшанаванне змеяў — у самым росквіце і многія трымаюць іх дома, як хатніх божышчаў.

Павага да змяі (ці змея) грунтавалася на ягоным вылучным становішчы ў міфалагічнай карціне свету. Жытло змея — Arbor Mundi, Сусветнае Дрэва (аснова асноваў усяго свету). Звычайна лічылася, што змей жыве ў каранях дрэва (паводле старабеларускіх вераняў, змей жыў у дупле) і ахоўвае падземны свет і ўладарыць над ім.

Дзякуючы свайму надзвычайнаму становішчу змяя была сімвалам мудрасці, усёведання, магічных звышнатуральных здольнасцяў. Гэтыя здольнасці ад яе мог пераняць і чалавек — варта было толькі з’есці змяінага мяса. Адмыслова прыгатаванае змяінае мяса давала чалавеку, які пакаштаваў яго, здольнасць разумець гаворку жывёлаў.

Другая характэрная рыса змяі — працяглае жыццё і нават сакрэт неўміручасці. Мудрая і неўміручая змяя ведае ўсе таямніцы Зямлі, можа знаходзіць схаваныя скарбы, з лёгкасцю трапляе ў падземны свет. У побыце гэтая асаблівасць нярэдка станавілася прычынай адмоўнага стаўлення да змяі — яе лічылі памочніцай варажбітоў, чарадзеяў і варожых чалавеку сіл.

Ад змей залежала і пладароддзе зямлі. Іх прасілі-маліліся пра дождж, вільгаць, ураджаі. Гэтая змяіная здольнасць пазней была перанесеная на пладавітасць увогуле. Да змей сталі звяртацца з просьбамі памножыць статак жывёлы і нават часам — з просьбай пра нараджэнне сына ці дачкі.

Змеі жылі побач з людзьмі і сярод людзей. І гэтае суіснаванне паступова пачынала ўваходзіць не толькі ў людскія вераннi, але знаходзіла сваё адлюстраванне і ў побыце. У арнаменце, які выкарыстоўваўся, напрыклад, на вопратцы ці посудзе, нярэдка ўжываўся змяіны ўзор. Як зазначаў акадэмік Б. Рыбакоў, “спіралі змей абвіваюць пасудзіну і накрыўку да яе, змеі складаюць аснову татуіроўкі статуэтак. Часам на пасудзіне на бачным месцы змяшчаецца выразнае адлюстраванне змяі як асобнага сімвала; часта мы бачым парныя адлюстраванні змей. Злыя яны ці добрыя? Адказ вельмі дакладны”. І далей навуковец гаворыць пра змяіныя выявы на статуэтках, дзе змей старажытныя людзі малявалі ў вобласці жывата: яны былі ахоўніцамі чэрава, якое выношвае плод. Такім чынам, змеі былі носьбітамі дабра, ахоўніцамі самага дарагога.

Практычна да нашых дзён дажылі змяіныя выявы на вокнах сялянскіх хатаў на Гомельскім і Брэсцкім Палессі. Гэты арнамент павінен быў ахоўваць людское жытло ад усялякага ліха, а асабліва — ад благога вока. Адсюль, мабыць, і паданне пра дзвюх змей, што жывуць у кожнай хаце. Гэтыя змеі — заступніцы асобна гаспадара і гаспадыні. Змей неабходна было старанна ахоўваць, бо іх смерць непазбежна выклікала б смерць гаспадароў. Са змеямі была звязана і забарона секчы дровы ці калоць лучыну на парозе дома — там жылі хатнія гадзюкі, якім гэтыя дзеянні маглі пашкодзіць. Часта распавядалі і пра тое, што гадзюка (ці змяя ўвогуле) ведае, калі наступае куцця, і абавязкова да яе прыпаўзае...

Змеі карысталіся такой павагай, што існавалі нават змяіныя святы. Адно з іх звязвалі з першым веснавым з’яўленнем змей (25 сакавіка па новым стылі), а другое — з восеньскім выпраўленнем на зімоўку “ў вырай” (27 верасня).

Тут дарэчы будзе звярнуцца і да згаданага ўжо Змяінага Цара. Вобраз гэтай міфалагічнай істоты натхняў славутага Максіма Багдановіча:

Зіхацяць маёй кароны<br>
Залатыя рожкі,<br>
Цёмным бляскам адлівае<br>
Ўся луска мая.

Змяіны Цар (кароль ці каралева) быў вядомы вельмі шырока. З шэрагу іншых змей яго вылучала невялічкая залатая карона на галаве. Гэтую карону ён здымае толькі адзін раз у год — у дзень святых Пятра і Паўла: гэтым днём Змяіны Цар паўзе купацца ў крыніцы. Зняць карону ён можа і ў тым разе, калі яму пасцелюць упоперак шляху белую хусцінку і паставяць для яго малако. Карона Змяінага Цара валодае чароўнымі здольнасцямі: яна дорыць неўміручасць і ўладу над усім светам.

Зрэшты, што мы ўсё пра падземны свет?.. Змеі настолькі апанавалі міфалагічную свядомасць беларусаў, што нашыя продкі гатовыя былі бачыць іх паўсюдна: пра маланку яны казалі як пра вогненнага змея (“Змей неба перапалавініў”, “Змей неба паражагнуў”).

З гэтым вогненным змеем змагаўся Пярун. Нябесны змей — не роўня згаданым вышэй хатнім змеям: ён, як кажуць паданні, кроўны брат самага галоўнага чорта. Калі такі вогненны змей падае забіты, яго відаць здалёк: ён пачынае рассыпацца на дробныя частачкі ад самай хмары і да зямлі даляцае толькі агністым попелам, з-пад якога на паверхні зямлі потым нічога не вырастае.

... Змеі, мудрыя, неўміручыя істоты, жылі спрадвеку поруч і разам з нашымі продкамі. Будзем спадзявацца, што і год Змяі, які прыйшоў на нашую зямлю, будзе такім жа ўважлівым да нас, як змеі-ахоўніцы — да нашых прадзядоў.

*Лея МІЦЕВА*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*25 студзеня*

*Зак. 26у*

*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Юрыя Жукова*